**У. І. КУЛІКОВІЧ,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта

# ШЛЯХ ДА ПОСПЕХУ: матэрыялы для падрыхтоўкі да школьнай алімпіяды

**Далучэнне вучняў да алімпіяднага руху з'яўляецца плённым у тым выпадку, калі настаўнік пазнаёміць іх з тыповымі заданнямі і пастаянна будзе падтрымліваць цікавасць сваіх выхаванцаў да пошуку, творчага мыслення, да чытання лінгвістычных тэкстаў, аналізу моўных з'яў і фактаў. Прапанаваныя заданні, якія прайшлі апрабацыю на раённым і рэспубліканскім узроўнях, дазваляюць павысіць узровень падрыхтаванасці да лінгвістычнага конкурсу на алімпіядзе, звярнуць увагу на тыпалагічныя асаблівасці выніковага кантролю ведаў.**

**Спадзяёмся, што праца з гэтым дыдактычным матэрыялам дапаможа выявіць вучняў з добрым моваазнаўчым патэнцыялам, выкананне і аналіз заданняў паспрыяе ў дасягненні поспеху.**

## IX клас

1. Запішыце гукі, якія на пісьме перадаюцца падкрэсленымі літарамі ў словах. *(Максімальная колькасць балаў — 3.)*

1) На рацэ Іслач; 2) звышіндустрыяльны; 3) сястра ідзе; 4) сіні; 5) у іхняй хаце; 6) баскетбаліст.

2. Замяніце рускамоўныя словазлучэнні аднаслоўнымі беларускімі адпаведнікамі. Запішыце, пастаўце націскі. *(Максімальная колькасць балаў — 6.)*

Жена кузнеца — …, званый гость — …, гребец на лодке — …, участник свадебного обряда — …, гребец на сенокосе — …, жена дяди — … .

3. Спішыце сказы без арфаграфічных памылак. *(Максімальная колькасць балаў — 7.)*

1. Конязавод Л. Даватара спецыалізуецца па развядзенні Тракененскай пароды. Гэтая парода была выведзена ва Усходняй Прусіі і з'яўляецца гордасцю Германіі. 2. У Статуце Вялікага княства Літоўскага ёсць артыкул, дзе ўзгаданы пакаранні за згубу ці забойства сабакі. 3. Сітуацыя імкліва змяняецца, мне патрэбны намеснік па экспарце — не па маркецінгу ці чамусці яшчэ, — але я ні магу ўвесці такую пасаду, — скардзіцца Мікалай Яфімчык. 4. Можа, не ўсе памятаюць, што калісці барэль нафты каштаваў дзесяць долараў. 5. У вёсцы зарэгістраваны прыход Святога вялікамучаніка Панцеляймона. 6. Для прапаганды ідэі па школах ездзіць Эмілію Амбрызі. 7. Падраздзяленне МНС дастала пацярпелую з пад колаў «МАЗа» з дапамогай гідраўлічнага інструмента.

4. Запішыце па-беларуску. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

Приезжать каждое лето — …, забыть о родителях — …, прийти из любопытства — …, машина весом сто тонн — …, сеять рожь у леса — … .

5. Складзіце слоўнікавыя артыкулы са словамі *з'яўлены, з'яўнены, гасцёўня, гасцільня.* *(Максімальная колькасць балаў — 8.)*

**Узор:** Галадоўшчык, *-а, м.* Той, хто галадуе. *Двое сутак праседзелі галадоўшчыкі ў пастарунку.*

6. Пра каго ці пра што гаворыцца ў прапанаваных фразеалагізмах, прыказках, афарызмах? Запішыце. *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

**Узор:** *Цяжка ўздыхаецца, чаго няма жадаецца* — пра нязбытныя жаданні.

1. Няма такой крамы, дзе купляюць мамы. 2. Цесна, што голку не ўваткнеш. 3. Ані шэлега. 4. Гуслям, княжа, не пішуць законаў *(Янка Купала)*. 5. Голаму за пазуху. 6. Аўчынка не варта вырабу. 7. Свет не без добрых людзей. 8. Хоць гаць гаці.

7. Выявіце памылкі, якія існуюць у прыведзеных прыказках і прымаўках. Выпраўце іх і запішыце залацінкі народнай мудрасці ў адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай мовы. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

1. У калгасе язык не ўзачот: хто працуе, таму і пачот. 2. Рай і ад трэба таму, хто багат. 3. За памылку даюць па затылку. 4. Калі карман сухі, то і суд глухі. 5. Сцеражом нашы граніцы, як вачэй зяніцы.



Нацыянальная бібліятэка Беларусі
30н 7192-3

**8.** Пастаўце назоўнікі, што ў дужках, у патрэбнай форме. Запішыце гэтыя формы. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

1. Настаўнік быў добрым *(прамоўца)*. 2. Паказаць гэтаму *(зазнайка)*. 3. Яна нясмела называла яго *(дзядзька)*. 4. Ішлі разам з *(Вася)*. 5. Воўк з *(сабака)*. 6. Не было толькі малога *(кацяня)*. 7. Ткалі з *(лён)*. 8. Зззяць *(медзь)*. 9. Зграбаў *(далоні)*. 10. Табун *(коні)*.

**9.** Што для паэта Васіля Жуковіча з'яўляецца «несмяротным дарам»? Прааналізуйце верш, запішыце адказ і абгрунтуйце сваё рашэнне. *(Максімальная колькасць балаў — 3.)*

**Дар**

Петрарка, Пушкін, Багдановіч...
Ад Бога — несмяротны дар.
Эмоцый, думак рух у Слове,
Заўсёдная прысутнасць чар.
І вечная загадка-таямніца:
Як можа ў вершы цэлы свет змясціцца?

## X клас

**1.** Устанавіце, якімі гукамі адрозніваецца слова *сям'іска* ад *вятрыска*. Запішыце ў квадратныя дужкі і ахарактарызуйце толькі тыя гукі, якія ёсць у першым слове, але няма ў другім. *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

**2.** Запішыце, якія дарогі беларусы называюць наступнымі словамі. Для ўстанаўлення значэння выкарыстоўвайце кантэкст. *(Максімальная колькасць балаў — 3.)*

**Узор.** *Гасцінец* — дарога, абсаджаная дрэвамі.

Межытока — ...; мінавіца — ...; паваротка — ...; пагон — ...; палазня — ...; палявік — ... .

1. Калі мяжа ўперлася ў гасцінец, маці з сынам павярнулі ўлева *(Я. Брыль)*. 2. Мой край, ад крушыны горкі, на беразе цёплы дымок, табун выпівае зоркі з паверхні лясных межыток *(У. Караткевіч)*. 3. Шпакі вясною лятуць мінавіцай, буслы не прынясуць шчасця хатынцам *(С. Кухараў)*. 4. Віктар знарок вылез не ля сваёй хаты, а на паваротцы, што вяла да абор *(М. Стральцоў)*. 5. Жывёла ідзе з пагону ў хлеў *(Міхась Чарот)*. 6. Шмат слядоў я пакінуў на дарогах гразкіх, на скрыпучых струнах белых палазін *(Максім Танк)*. 7. Стараюся, каб хаця да цемначы выбрацца на віднейшае, на палявік, але дзе там *(С. Кухараў)*.

**3.** Устаўце, дзе гэта неабходна, прапушчаныя літары, знакі прыпынку, раскрыйце дужкі, замяняючы рускамоўныя выразы беларускімі аднаслоўнымі адпаведнікамі. Запішыце. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

1. Ужо зусім на сконе быў жнів..нь бо тыя колькі дзён якія заставаліся ў ягоным кал..ндары ці маглі дадаць яшчэ што ва..кае на н..бачныя *(чашечные весы)*. 2. На..піс бя..спрэчна атрымаўся *(который легко читается)* іначай муж-афіцэр н.. схапіў бы ўначы пісм.лет. 3. Уваткну..шы канец кас..я ў мяк..ую з..млю трымаючы моцна рукой тупы край касы Васіль стаў *(точить косу с помощью специальной наждачной лопатки)*. 4. Кленчаць набожныя кат..лікі разгорт..ваюць *(сборники католических молитвенных песен)*. 5. Дрэвы на гэты час закупчасціліся, і Антон, стоячы на ніжніх прыступках ганка, бачыў вузкі кавалачак *(вымощенной камнем дороги)*.

**4.** Складзіце слоўнікавыя артыкулы са словамі *паспаліты, наземіца, лежыва, спартовы*. *(Максімальная колькасць балаў — 8.)*

**Узор:** Галадоўшчык, *-а, м.* Той, хто галадуе. *Двое сутак праседзелі галадоўшчыкі ў пастарунку.*

**5.** Устанавіце, якімі членамі сказа з'яўляюцца інфінітывы. Адказ афарміце ў выглядзе табліцы. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

| № п/п | Інфінітыў | Член сказа |
|---|---|---|
| 1. | | |
| 2. | | |
| 3. | | |
| 4. | | |
| 5. | | |

1. Ты думаеш — пісаць, дык гэта не работа? *(Якуб Колас)*. 2. Працаваць дык працаваць *(Кузьма Чорны)*. 3. Рабіць, дык рабіў *(М. Лынькоў)*. 4. Лясныя рэкі вучылі плаваць *(П. Панчанка)*. 5. Каманду «стаяць» пачулі не ўсе *(І. Шамякін)*.

**6.** У сучаснай беларускай мове злучнік *дык* можа выкарыстоўвацца для сувязі састаўных частак у структуры як складаназлучаных, так і складаназалежных сказаў. Устанавіце, якія адносіны выражаюцца паміж часткамі, аб'яднанымі гэтым злучнікам. Запішыце сказы ў прапанаванай паслядоўнасці. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

**1.** Сказы, паміж часткамі якіх існуюць адносіны неадпаведнасці.

**2.** Сказы, паміж састаўнымі часткамі якіх выражаюцца супраціўныя адносіны.

**3.** Складаназлучаныя сказы з далучальна-супраціўнымі адносінамі, ускладненымі вылучальна-ўзмацняльным адценнем.

4. Складаназалежныя сказы з умоўна-выніковымі адносінамі.

5. Складаназалежныя сказы з прычынна-выніковымі адносінамі.

1. Была адна надзея, дык і тая сёння прапала *(П. Пестрак)*. 2. Пара б і вучыцца, дык школы няма *(Якуб Колас)*. 3. Прадвесне гэта было, дык лёд на Нёмане нават угінаецца *(Я. Брыль)*. 4. Я яму кагадзе палажыў травы з балота, дык ён не есць *(Кузьма Чорны)*. 5. Меў бы ты халацік новы, дык які б ты быў жабрак *(Якуб Колас)*. 6. Хацеў выспацца, дык не даюць *(Кузьма Чорны)*. 7. Тут неяк так душна, дык я ўзяла ды пабегла на сенажаць *(Янка Купала)*. 8. Дзве фурманкі прыехалі былі на вяселле, дык і тыя сёння рана паехалі дадому *(Кандрат Крапіва)*. 9. Частую добрай скваркай, дык не бяруць яны *(Максім Лужанін)*. 10. Кралі хоць пальцам, дык з зямлёй змяшаю! *(Янка Купала)*.

7. Завяршыце сказ. *(Максімальная колькасць балаў — 7.)*

Злучальныя словы адносяцца не да службовых, а да знамянальных часцін мовы і характарызуюцца тым, што ______________________________
______________________________
______________________________
______________________________
______________________________
______________________________
______________________________
______________________________
______________________________
______________________________

8. Устанавіце памылкі, якія існуюць у прыведзеных прыказках і прымаўках. Выпраўце іх і запішыце залацінкі народнай мудрасці ў адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай мовы. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

1. Хто за правае дзела стаіць, той заўсёды пабядзіць. 2. Дзе лёгкая прыбыль, там цяжкая гібель. 3. Раз украў — навек славу замараў. 4. На злодзеі шапка гарыць. 5. З'еш почку, возьмеш папову дочку.

9. Ажыццявіце перастаноўку і замену асобных слоў у творы, каб тэкст ператварыўся ў акраверш, прысвечаны Тані. *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

Наша Таня горка плача —
Закаціўся ў рэчку мячык.
— Ціха, Танечка, не плач,
Не затоне ў рэчцы мяч.

## XI клас

1. Падбярыце беларускія адпаведнікі да наступных слоў. Размяркуйце іх у два слупкі: у першым — з цвёрдым вымаўленнем зычнага перад [э]; у другім — з мяккім вымаўленнем зычнага. Запішыце. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

Тефлон, демон, плиссе, лазер, Одесса, диспансер, кегли, проект, фанера, леди, бассейн, индекс, сонет, маузер, буриме, депутат, бифштекс, нетто, фонетика, термос.

2. Спішыце сказы, выправіўшы арфаграфічныя памылкі. *(Максімальная колькасць балаў — 7.)*

1. Амаль палавіна сярэднемесячнай нормы апаткаў выпала 27 ліпеня. 2. У самы разгар ягаднага сязону ў глухіх дрэтуньскіх лясах 16 каманд з Полацка і раёна паспаборнічаюць ва уменні збіраць ягады. 3. Сяўбу гароху пачыналі ў пэўныя дні. Найбольш спрыяльным лічыўся аўторак на Страстным тыдні. 4. Яўгенія рассказала, што яе сям'я вырашыла зэканоміць на забавах. 5. Другое і апошняе выданне заблудаўскай друкарні — «Псалтыр з Часасловам» — выйшла ў свет 23 сакавіка 1570 г. 6. Толькі ў чацвертым квартале 2009 года рост рэзерваў КНР склаў 126 міліярдаў доллараў. Рэзервы выраслі ў першую чаргу з-за гандлёвага прэфіцыту КНР, а таксама прытоку інвесціцый у краіну. 7. У поўфінале кубка — без сэнсацый.

3. Якім словам сінанімічныя па сваім значэнні прыметнікі з прэфіксам *звыш-*? Запішыце гэтыя словы, замяняючы толькі прэфікс. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

Звышвысокі — ..., звышмодны — ... , звышчалавечы — ..., звышштатны — ... .

4. Суаднясіце агульныя значэнні прыметнікаў са словамі, якія маюць гэтыя значэнні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

| | |
|---|---|
| А. 'разумны, дасціпны' | 1) цывілізаваны |
| Б. 'культурны, асвечаны' | 2) цямлівы |
| В. 'таленавіты' | 3) дзікі |
| Г. 'неадукаваны, некультурны' | 4) геніяльны |
| | 5) талковы |
| | 6) абмежаваны |
| | 7) творчы |
| | 8) цікавы |

А____, Б____, В____, Г____.

5. Адрэдагуйце сказы, замяніўшы падкрэсленыя словазлучэнні аднаслоўнымі

адпаведнікамі, якія з'яўляюцца безэквівалентнымі ў дачыненні да рускай мовы. Запішыце толькі беларускія адпаведнікі. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

1. На гэтай пустой кватэры збіраліся студэнты, што заставаліся жыць летам у горадзе. 2. Мабыць, нуду такую самую адчувалі і каровы, бо глыбакадумна галовы паспушчалі; рэшта нюхаюць траву, нехаця выбіраючы па асобна ўзятай расліне. 3. Падымалі яго а сёмай гадзіне раніцы. Бадай, вельмі позна, бо ў Ашмянах уставалі раней. 4. Прылёгшы на змалотым зерні гарачым, дадому вяртаемся ў поўнач дарогай знаёмай. 5. Яму душу адкрыць ахвота — наросхрыст, насцеж, нарасхляб, каб выйшла вон уся душэўная мука, пераажыванне — на суд людскі і на разгляд. 6. Ледзь чутна папісквалі ў злепленым пад самым вільчыкам гняздзечку дзеці ластаўкі. 7. Каталіцкі свята, які ўзначальвае прыход, у турботах не разагнуў спіны ў касцельным сутарэнні. 8. Святлеў, станавіўся прасторней намружысты, вузкі калідор у суботу па апошняй лекцыі. 9. Удзельнікі спаборніцтва не хочуць, каб іхнія машыны прастойвалі лішне на рамонтных канавах. 10. Назад варочаецца вяселле ўжо перад наступленнем вечара.

**6.** Запішыце словы ў адпаведныя слупкі табліцы. *(Максімальная колькасць балаў — 6.)*

| Сфера сучаснага жыцця | Словы |
|---|---|
| Палітыка, сацыяльны лад, ідэалогія | |
| Культура і шоу-бізнес | |
| Быт | |

Арганайзер, байкер, гамбургер, інаўгурацыя, кабукі, перформанс, прадзюсар, саміт, спічрайтар, фаст-фуд, шэйкер, электарат.

**7.** Запішыце лічбы словамі. Пастаўце іх у патрэбным склоне. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

1. Завяршаецца 2013 год. 2. Галерэя ўпрыгожана 546 каляровымі пейзажамі. 3. Колькасць удзельнікаў вагаецца паміж 457 і 502. 4. Прафесар убачыў у аўдыторыі 23 студэнтаў.

**8.** Выпішыце і патлумачце лексічныя адзінкі, якія абыгрываюцца ў дыялогу з п'есы Кандрата Крапівы «Канец дружбы». *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

К а р н е й ч ы к. Не хочаш вітаць — чорт з табой! Раскажы, як у цябе там на вёсцы справа?

Л ю т ы н с к і. Як справа, так і злева — кругом дрэнь.

**9.** Якому паэту прысвяціў свой твор Рыгор Барадулін? Абгрунтуйце сваё рашэнне. *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

Акраверш з нагоды юбілею.
Рыфма цягне пад ялей балею.
Калядуюць вобразы. Аднак
Аглядае ўзрыхленыя ляды
Дбалы сейбіт, шчодры на прыгады,
Заручоны з радасцю юнак.
Юбіляр трымае Сцяг брыгады.
Коціць хвалі акіян на звады,
Уладарыць акіян-бурлак.
Лепш, радок, не ткніся выпадкова!
Ямб слухмяна гнецца, як падкова.
Шэпча нешта Бесядзі дуброва.
Одум — не ачахлы крыгаход.
Восень, пакладзі зеленаброва
Умалот на шалі строгіх год!

## ДАВЕДКІ

### IX клас

**1.** 1) [йі], 2) [ы], 3) [й], 4) [і], 5) [йі], 6) [д].

**2.** Жена кузнеца — *кавалі́ха*; званый гость — *бясе́днік*; гребец на лодке — *вясля́р*; участник свадебного обряда — *вясе́льнік*; гребец на сенокосе — *грабе́льнік*, жена дяди — *дзя́дзіна*.

**3.** 1. Конезавод Л. Даватара спецыялізуецца па развядзенні тракененскай пароды. Гэтая парода была выведзена ва Усходняй Прусіі і з'яўляецца гордасцю Германіі. 2. У Статуце Вялікага Княства Літоўскага ёсць артыкул, дзе ўзгаданы пакаранні за згубу ці забойства сабакі. 3. Сітуацыя імкліва змяняецца, мне патрэбны намеснік па экспарце — не па маркетынгу ці чамусьці яшчэ, — але я не магу ўвесці такую пасаду, — скардзіцца Мікалай Яфімчык. 4. Можа, не ўсе памятаюць, што калісьці барэль нафты каштаваў дзесяць долараў. 5. У вёсцы зарэгістраваны прыход Святога велікамучаніка Панцеляймона. 6. Для прапаганды ідэі па школах ездзіць Эміліа Амбрызі. 7. Падраздзяленне МНС дастала пацярпелую з-пад колаў «МАЗа» з дапамогай гідраўлічнага інструмента.

**4.**

| | |
|---|---|
| Приезжать каждое лето. | Прыязджаць кожнае лета / або: Прыязджаць штолета. |
| Забыть о родителях. | Забыцца на бацькоў / або: Забыцца пра бацькоў. |
| Прийти из любопытства. | Прыйсці дзеля цікавасці / або: Прыйсці з-за цікавасці. |
| Машина весом сто тонн. | Машына вагою ў сто тон / або: Машына вагою сто тон. |
| Сеять рожь у леса. | Сеяць жыта пад лесам / або: Сеяць жыта каля лесу. |

**5. Заўвага.** Прыклады ў вучняў могуць быць свае. Галоўнае, каб яны ілюстравалі значэнне слова.

**З'яўлены**, *-ая, -ае.* Які з'явіўся, паказаўся перад вачамі. *З'яўленыя слёзы Марылі растрывожылі сэрца Міхася.*

**З'яўнены**, *-ая, ае.* Які стаўся яваю, рэальнасцю. *Усё навокала мяне і ўва мне прanялося нарэшце-такі сонцам, так з'яўненым, а невідомым* (Н. Мацяш).

**Гасцёўня**, *-і, ж.* 1. Пакой для прыёму гасцей; гасціная. *Сяброў у яго шмат, а гасцёўня — цеснаватая* (Максім Лужанін). 2. Памяшканне, дзе праводзяцца сустрэчы, культурныя мерапрыемствы для аматараў літаратуры і мастацтва. *У гасцёўні Галубка.*

**Гасцільня**, *-і, ж.* Гасцініца. *Ноч... Гасцільня... Горад даўно апусцеў* (У. Караткевіч).

6. 1. *Няма такой крамы, дзе купляюць мамы* — пра неабходнасць беражлівага стаўлення (беражлівых адносін) да бацькоў. 2. *Цесна, што голку не ўваткнеш* — пра вялікую колькасць людзей. 3. *Ані шэлега* — пра адсутнасць грошай. 4. *Гуслям, княжа, не пішуць законаў* — пра свабоду творчасці. 5. *Голаму за пазуху* — пра невялікую колькасць. 6. *Аўчынка не варта вырабу* — пра нявыгадную справу. 7. *Свет не без добрых людзей* — пра надзею на спачуванне і дапамогу. 8. *Хоць гаць гаці* — пра вялікую колькасць.

7. 1. У калгасе язык не *ўзачот*: хто працуе, таму і *пачот*. — У калгасе язык *не залічваецца*: хто працуе, таму і *пашана*. 2. Рай і *ад* трэба таму, хто багат. — Рай і *пекла* трэба таму, хто багаты. 3. За памылку даюць па *затылку*. — За памылку (абмылку) даюць па *патыліцы*. 4. Калі *карман* сухі, то і суд глухі. — Калі *кішэня* сухая, то і суд глухі. 5. Сцеражом нашы граніцы, як вачэй *зяніцы*. — Сцеражом нашы граніцы, як вачэй *зрэнкі*.

8. 1) Прамоўцам; 2) зазнайку; 3) дзядзькам; 4) з Васем; 5) з сабакам; 6) кацяняці; 7) з ільну; 8) меддзю; 9) далонямі; 10) коней.

9. Несмяротным дарам для паэта з'яўляецца *паэзія*. Пра гэта нам сведчаць першыя літары акраверша, з якіх складаецца слова.

### X клас

1. [с'] — зычны мяккі, свісцячы, парны па звонкасці/глухасці і па цвёрдасці/мяккасці;
   [м] — зычны цвёрды, губны, санорны, парны па цвёрдасці/мяккасці;
   [й] — зычны санорны, няпарны;
   [і] — галосны націскны.

2. *Межытока* — дарога, якая злучае два возеры або балоты; *мінавіца* — шлях або дарога, якая праходзіць міма чаго-небудзь; *паваротка* — дарога, якая адыходзіць у бок ад асноўнай магістралі; *пагон* — дарога, па якой гоняць скаціну на пашу; *палазня* — дарога, пракладзеная палазамі; *палявік* — палявая дарога.

3. 1. Ужо зусім на сконе быў жнівень, бо тыя колькі дзён, якія заставаліся ў яго ным календары, ці маглі дадаць яшчэ што важкае на нябачныя шалі. 2. Надпіс, бясспрэчна, атрымаўся чытэльны, іначай муж-афіцэр не схапіў бы ўначы пісталет. 3. Уваткнуўшы канец касся ў мяккую зямлю, трымаючы моцна рукой тупы край касы, Васіль стаў мянташыць. 4. Кленчаць набожныя каталікі, разгортваюць кантычкі. 5. Дрэвы на гэты час закупчасціліся, і Антон, стоячы на ніжніх прыступках ганка, бачыў вузкі кавалачак бруквавнкі.

4. **Заўвага.** Прыклады ў вучняў могуць быць свае. Галоўнае, каб яны ілюстравалі значэнне слова.

**Паспаліты**, *-ая, -ае.* Звычайны, звыклы. *Не ведаю, ці зразумее паспаліты глядач усю сімволіку спектакля* (ЛіМ).

**Наземіцца**, *-міцца; незак.* Апускацца на зямлю. *На жвір аблятаюць лісты, наземяцца з ціхай малітвай* (У. Дубоўка).

**Лежыва**, *-а, н.* Месца для часовага ляжання, знаходжання каго-небудзь. *Шыгалле, якое ляжала тут скрозь, заставалася амаль сухое, яго можна было згрэбці ў яміну паміж карэння, каб зрабіць сабе лежыва* (І. Чыгрынаў).

**Спартовы**, *-ая, -ае.* Спартыўны. *Збоч вуліцы выскачылі двое ў спартовых гарнітурах* (В. Быкаў).

5.

| № п/п | Інфінітыў | Член сказа |
|---|---|---|
| 1. | пісаць | дзейнік |
| 2. | працаваць дык працаваць | выказнік |
| 3. | рабіць | уваходзіць у склад выказніка |
| 4. | плаваць | дапаўненне |
| 5. | стаяць | азначэнне |

6. 1. Сказы, паміж часткамі якіх існуюць адносіны неадпаведнасці: *Пара б і вучыцца, дык школы няма*; *Хацеў выспацца, дык не даюць.* — Складаназлучаныя сказы з гэтымі адносінамі характарызуюцца тым, што паведамленае ў другой састаўной частцы не адпавядае таму, аб чым паведамляецца ў першай частцы.

2. Сказы, паміж састаўнымі часткамі якіх выражаюцца супраціўныя адносіны: *Я яму кагадзе палажыў травы з балота, дык ён не есць*; *Частую добрай скваркай, дык не бяруць яны.* — Сказы з такімі адносінамі характарызуюцца тым, што паведамленае ў адной састаўной частцы супрацьлеглае таму, што паведамляецца ў другой.

3. Складаназлучаныя сказы з далучальна-супраціўнымі адносінамі, ускладненымі вылучальна-ўзмацняльным адценнем: *Была адна надзея, дык і тая сёння прапала*; *Дзве фурманкі прыехалі былі на вяселле, дык і тыя сёння рана паехалі дадому.* — Такія сказы характарызуюцца тым, што далучаемая частка ўдакладняе папярэднюю (асноўную) частку шляхам вылучэння таго, на што трэба звярнуць асаблівую ўвагу. Тое, што патрабуе свайго вылучэння, абазначаецца ў далучаемай частцы ўказальным займеннікам *той*, перад якім заўсёды стаіць часціца *і*, якая і суправаджае падобнае вылучэнне ўзмацняльным адценнем.

4. Складаназалежныя сказы з умоўна-выніковымі адносінамі: *Меў бы ты халацік новы, дык які б ты быў жабрак*; *Крані хоць пальцам, дык з зямлёй змяшаю!* — Сказы характарызуюцца тым, што паведамленае ў другой састаўной частцы можа ажыццявіцца толькі пры той умове, аб якой паведамляецца ў першай частцы.

5. Складаназалежныя сказы з прычынна-выніковымі адносінамі: *Прадвесне гэта было, дык лёд на Нёмане нават угінаецца*; *Тут неяк так душна, дык я ўзяла ды пабегла на сенажаць.* — У першай састаўной частцы такіх сказаў указваецца прычына або даецца абгрунтаванне таго, што з'яўляецца вынікам і аб чым паведамляецца ў другой частцы.

7. Злучальныя словы адносяцца не да службовых, а да знамянальных часцін мовы і характарызуюцца тым, што:

1) не толькі звязваюць дадзеныя часткі з галоўнымі, але і захоўваюць сваё асноўнае значэнне;

2) заўсёды выконваюць ролю поўных членаў сказа;

3) маюць указальнае значэнне і могуць іншы раз замяняцца словамі з галоўнай часткі;

4) могуць мець лагічны націск;

5) іх нельга апусціць са сказа;

6) злучальныя словы, якія паходзяць ад займеннікаў, могуць ужывацца з прыназоўнікамі;

7) злучальнае слова можна замяніць іншым злучальным словам (сінонімам).

**8.** 1. Хто за *правае дзела* стаіць, той заўсёды *пабядзіць*. — Хто за *справядлівую справу* стаіць, той заўсёды *пераможа*. 2. Дзе лёгкая *прыбыль*, там цяжкая гібель. — Дзе лёгкі *прыбытак*, там цяжкая гібель. 3. Раз украў — навек славу *замараў*. — Аднойчы (раз) украў — навек славу *запэцкаў*. 4. На *злодзеі* шапка гарыць. — На *злодзею* шапка гарыць. 5. З'еш *почку*, возьмеш папову *дочку*. — З'еш *нырку*: возьмеш папову *дачку*.

9. Таня наша горка плача —
Апынуўся ў рэчцы мячык.
— Не ўзнімай, Танюша, плач,
Я дастану з рэчкі мяч.

**XI клас**

**1.**

| Словы з цвёрдым вымаўленнем зычнага перад [э] | Словы з мяккім вымаўленнем зычнага перад [э] |
|---|---|
| Тэфлон, дэман, плісэ, Адэса, лэдзі, індэкс, бурымэ, дэпутат, біфштэкс, тэрмас. | Лазер, дыспансер, кеглі, праект, фанера, басейн, санет, маўзер, нета, фанетыка. |

**2.** 1. Амаль палавіна сярэднямесячнай нормы ападкаў выпала 27 ліпеня. 2. У самы разгар ягаднага сезону ў глухіх дрэтуньскіх лясах 16 каманд з Полацка і раёна паспаборнічаюць ва ўменні збіраць ягады. 3. Сяўбу гароху пачыналі ў поўныя дні. Найбольш спрыяльным лічыўся аўторак на Страсным тыдні. 4. Яўгенія расказала, што яе сям'я вырашыла сэканоміць на забавах. 5. Другое і апошняе выданне Заблудаўскай друкарні — «Псалтыр з Часасловам» — выйшла ў свет 23 сакавіка 1570 г. 6. Толькі ў чацвёртым квартале 2009 года рост рэзерваў КНР склаў 126 мільярдаў долараў. Рэзервы выраслі ў першую чаргу з-за гандлёвага прафіцыту КНР, а таксама прытоку інвестыцый у краіну. 7. У паўфінале кубка — без сенсацый.

**3.** Звышвысокі — ультравысокі, звышмодны — архімодны, супермодны, звышчалавечы — надчалавечы, звышштатны — пазаштатны.

1. Па сваім значэнні прыметнікі з прэфіксам *звыш-* сінанімічныя прыметнікам з запазычанымі прэфіксамі *архі-*, *супер-*, *ультра-*, надзеленых такім жа значэннем — 'празмернай, крайняй ступенню праяўлення прыметы': *звышвысокі — ультравысокі, звышмодны — архімодны, супермодны.*

2. Прыметнікі з прыстаўкай *звыш-* могуць выражаць значэнне 'перавышэнне мяжы, меры чаго-небудзь'. У такім выпадку яны блізкія па значэнні да прыметнікаў з прыстаўкамі *над-*, *паза-*: *звышчалавечы — надчалавечы, звышштатны — пазаштатны.*

**4.**

| | |
|---|---|
| А — 2 (цямлівы), 5 (талковы). | В — 4 (геніяльны), 7 (творчы). |
| Б — 1 (цывілізаваны), 8 (цікавы). | Г — 3 (дзікі), 6 (абмежаваны). |

**5.** 1) Летаваць, 2) каліва, 3) запозна, 4) мліва, 5) згрызота, 6) ластавяняты, 7) пробашч, 8) прастарнеў, 9) спаборнікі, 10) надвячоркам.

**6.**

| Сфера сучаснага жыцця | Словы |
|---|---|
| Палітыка, сацыяльны лад, ідэалогія | інаўгурацыя, саміт, спічрайтар, электарат |
| Культура і шоу-бізнес | байкер, перформанс *(тэатралізаванае выступленне з элементамі гульні і гратэску)*, прадзюсар, кабукі *(від традыцыйнага японскага тэатра)* |
| Быт | арганайзер, фаст-фуд *(хуткае харчаванне)*, шэйкер *(пасудзіна для змешвання кампанентаў, неабходных для прыгатавання кактэйляў)*, гамбургер |

**7.** 1. Завяршаецца дзве тысячы трынаццаты год. 2. Галерэя ўпрыгожана пяццюстамі сарака шасцю каляровымі пейзажамі. 3. Колькасць удзельнікаў вагаецца паміж чатырмастамі пяццюдзесяццю сямю і пяццюстамі двума. 4. Прафесар убачыў у аўдыторыі дваццаць трох студэнтаў.

**8.** Абыгрываюцца амаформы: *справа* — назоўнік 'работа, становішча' і *справа* як прыслоўе 'з правага боку'.

**9.** Аркадзю Куляшову (1 бал). Гэта акраверш — па вертыкалі можна прачытаць, каму ён прысвечаны (1 бал), Р. Барадулін згадвае творы А. Куляшова «Сцяг брыгады» (1 бал), назву ракі Бесядзь (1 бал), якую А. Куляшоў праславіў у сваім вершы «Мая Бесядзь».